ДА ДНЯ ЎСЕНАРОДНАЙ ПАМЯЦІ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА — 22 ЧЭРВЕНЯ

Ірына ЧЫКАЛАВА

# АДЗІН З МІЛЬЁНАЎ САЛДАТ ПЕРАМОГІ: ЭДУАРД БЫЛІНКА (1919—1943)

**Значэнне дакументаў асабістага паходжання для гістарычных даследаванняў па-ранейшаму не губляе сваёй актуальнасці. Лісты, дзённікі, успаміны, фатаграфіі адлюстроўваюць самыя розныя бакі жыцця чалавека і грамадства. Неабходна ўключаць у навуковы зварот не страчаныя дакументы, якія захоўваюцца ў сем'ях. Менавіта яны разам з дакументамі Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны (ЦАМА) Расійскай Федэрацыі, што знаходзяцца ў адкрытым доступе на парталах "Подзвіг народа" і "Памяць народа", дазволілі асвятліць жыццё аднаго з мільёнаў салдат Перамогі, аднаго з сотняў тысяч абаронцаў Сталінграда і ўдзельнікаў баёў на Арлоўска-Курскай дузе Эдуарда Станіслававіча Былінкі, які ваяваў у складзе 7-га бамбардзіровачнага авіяцыйнага палка 53-й авіядывізіі далёкага дзеяння, і яго сям'і.**

Эдуард Станіслававіч Былінка нарадзіўся ў 1919 г. у вёсцы Росіца Верхнядзвінскага раёна. Бацькамі Эдуарда былі простыя сяляне, жыхары Росіцы Мальвіна Казіміраўна і Станіслаў Фаміч Былінкі. Эдзік быў малодшым у сям'і. Ён вельмі сябраваў са сваёй старэйшай сястрой — Канстанцыяй.

Эдуард скончыў Росіцкую сямігадовую школу. Пра гэта сведчыць фота "Ударнікі вучобы Росіцкай школы", якое захавалася ў сямейным архіве. Захапленне маляваннем, якое палюбіў у дзяцінстве, прывяло Эдуарда ў Віцебскі мастацкі тэхнікум, па заканчэнні якога ён з'ехаў у Ленінград. Там пачаў працаваць настаўнікам малявання і, па ўспамінах сястры Канстанцыі, працягваў вучыцца.

Другім захапленнем Эдуарда стала фатаграфія, для чаго ён набыў фотаапарат. Дзякуючы Эдуарду летам 1936 г. сям'я была зафіксаваная на фотаздымках. Ён склаў сямейны фотаальбом. Гэтыя фатаграфіі, мабыць, адзіныя ацалелыя, на якіх адлюстраваныя жыхары Росіцы ў перадваенныя гады.

У адзін з дзён лета 1937 г. у сям'і Былінкаў згарэў дыхтоўны бацькоўскі дом. Хтосьці зладзіў падпал. Але бяда не прыходзіць адна. Многія аднавяскоўцы былі абвінавачаны ў шпіянажы на карысць Латвіі або Польшчы, альбо ў антысавецкай агітацыі, альбо ва ўдзеле ў шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі.

7 красавіка 1938 г. Станіслаў Былінка быў арыштаваны. Так сям'я, якой паведамілі судовы вердыкт "*дзесяць гадоў без права перапіскі*", засталася без яе главы. Ніхто не ведаў, што пад гэтай фармулёўкай хаваўся расстрэльны прысуд: вышэйшая мера пакарання. Прысуд ад 26 траўня 1938 г. быў прыведзены ў выкананне 13 ліпеня таго ж го-



**ЧЫКАЛАВА Ірына Рамуальдаўна.**

*Загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар. Нарадзілася ў Мінску. У 1983 г. скончыла МДПІ імя Максіма Горкага. У 2001 г. абараніла доктарскую дысертацыю на тэму "Гендерная политика ведущих партий США и Великобритании в 1970 — 1990-е гг." З 1989 г. працуе ў БДПУ імя Максіма Танка. Аўтар больш за 260 артыкулаў, шэрагу вучэбных дапаможнікаў, падручніка для гістарычных факультэтаў "Новая история стран Европы и Северной Америки (1815—1918)" (Минск, 2009, 2013), шэрагу манаграфій ("Партии, профессиональные союзы, женские организации во Франции, Германии, Великобритании (1815—1914)" (Минск, 2015), "Великобритания: изучение в Российской империи (XIX — начало XX в.)" (СПб., 2017), "Великобритания: осмысление исторического опыта в Российской империи (XIX — начало XX в.)" (Минск, 2018), "(Не)забытая война: Первая мировая война в документах, публицистике, воспоминаниях и исследованиях современников (1914—1941)" (Минск, 2022) і інш.); суаўтар калектыўных манаграфій "Идеи и люди: интеллектуальная культура Европы в Новое время" (Москва, 2014), "История белорусской государственности" (Т. 5. Минск, 2020), ""Свои", "Другие", "Чужие": из истории взаимодействия и противостояния Запада, Востока и России" (СПб., 2021) і інш.*

## ДА ДНЯ ЎСЕНАРОДНАЙ ПАМЯЦІ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА — 22 ЧЭРВЕНЯ



**Мальвіна Казіміраўна і Станіслаў Фаміч Былінкі, Эдуард і яго пляменнік Рамуальд Чыкалаў (злева направа). Сямейны архіў.1937 г.**



**Эдуард Былінка. Сямейны архіў. 1940 г.**



**Ударнікі вучобы Росіцкай школы: на фатаграфіі другі справа ў трэцім шэрагу — Эдуард Былінка. Сямейны архіў. 1934 г.**

да ў Полацку. Але пра гэта блізкім стане вядома толькі праз 20 гадоў з даведкі аб рэабілітацыі[4].

Дачцэ і ўнуку далі магчымасць пазнаёміцца з асабістай справай бацькі. У ім ляжала ўсяго тры лісткі, сярод іх — у няпоўную старонку тэкст даносу: *"Станіслаў Былінка працуе на латвійскую выведку"*. Так росчыркам пяра просты 60-гадовы селянін стаў агентам замежнай выведкі, а яго сям'я — сям'ёй ворага народа.

Пасля гэтых падзей жыццё трэба было пачынаць зноўку. Канстанцыя з сынам пераехала ў Оршу ў 1939 г., працавала на чыгунцы. Да іх пераехала і Мальвіна Казіміраўна.

Тым часам у 1940 г. у Ленінградзе Маскоўскім раённым ваенным камісарыятам Эдуард быў прызваны на тэрміновую службу ў войска, дзе скончыў курсы радыстаў. Спачатку Вялікай Айчыннай вайны ён у званні малодшага сяржанта служыў стралком-радыстам у 7-м бамбардзіровачным авіяцыйным палку[5] 53-й авіяцыйнай дывізіі далёкага дзеяння, якая базавалася ў Мічурынску Тамбоўскай вобласці[6]. Яго родныя эвакуяваліся ў Тамбоў. У дакументах нават захаваўся адрас іх пражывання: Тамбоў, вул. Чыгуначная, д. 29[7]. Так, воляй лёсу яны апынуліся зусім недалёка адзін ад аднаго і нават змаглі два разы сустрэцца.

Да канца ліпеня 1942 г. 53-я авіядывізія на самалётах ТБ-3 дзейнічала на Варонежскім фронце. З 18 ліпеня па 18 лістапада 1942 г. дывізія ўдзельнічала ў Сталінградскай абарончай аперацыі. У снежні 1942 г. — студзені 1943 г. часткі дывізіі падтрымлівалі наземныя войскі ў ходзе контрнаступлення пад Сталінградам і ў аперацыях па разгрому акружанай групоўкі праціўніка. Яе асноўнымі задачамі былі нанясенне бомбавых удараў па рэзервах, танках і мотамеханізаваных частках, эшалонах, складах боепрыпасаў і паліва, знішчэнне самалётаў ворага на аэрадромах.

З лета 1942 г. 3-я эскадрылля 7-га авіяпалка 53-й дывізіі пачала перавучванне і пераход на транспартныя бамбардзіроўшчыкі ЛІ-2. Хаця ЛІ-2 не валодаў дастатковай хуткасцю і манеўранасцю, аднак у палёце быў устойлівы, яго прасторная кабіна з неабходнымі прыборамі, падвойнае кіраванне, ацяпленне і вентыляцыя рабілі самалёт вельмі зручным для выканання працяглых палётаў. Экіпаж, у склад якога ўваходзіў стралок-радыст Э.Былінка, здзяйсняў рэгулярныя начныя налёты на пазіцыі нацыстаў у раёне Сталінграда. Падняўшыся з аэрадрома, у цемры яны падляталі да Волгі, дзе пражэктарамі з левага берага пазначалася паласа бамбавання. У пачатку 1943 г. на ўзбраенні 53-й авіядывізіі ўжо было 36 такіх самалётаў і 15 самалётаў ТБ-3[8].

У рэдкія хвіліны адпачынку Эдуард маляваў алоўкам партрэты сваіх аднапалчан, якія ім жа дарыў. Таму ў яго сям'і практычна не захавалася завершаных работ Эдуарда. Унук аднаго з аднапалчан — Аляксандра Цімафеевіча Лупіка — знайшоў у сямейным архіве партрэт свайго дзеда, выкананы Эдуардам Былінкам і падпісаны: "*Будзь такім квітнеючым, як на гэтым партрэце, ва ўсякія часы жыцця, і тады табе будзе лёгка заўсёды. На памяць ад Былінкі Э. Сашы Лупіку*".

Эдуард рэгулярна пісаў лісты родным. Захаваўся толькі адзін з іх, адрасаваны 11-гадоваму пляменніку Рамуальду і адпраўлены з Мічурынска ў Тамбоў. Як мяркуецца, ён быў напісаны ў канцы 1942 г. — пачатку 1943 г.*.

---

* Тут і далей тэксты прыводзяцца на мове арыгінала з захаваннем арфаграфічных і стылістычных асаблівасцяў.



Дорогой Ромочка.
Мой тебе боевой привет!
И еще, привет бабушке.
Рядом сидит твоя мамка, и дядя
Василий, и рассказывают о тебе.
Они говорят что ты парень —
герой, отличник. Очень образованный,
что ты сов. информбюро и хулиган.
Это верно? Только зачем-же
плакать? Мамка едет ко мне, а
ты в слезы. Это тебе не идет.
Ты знаешь, я наверно к тебе
и к бабушке приеду. Каким обра-
зом мамка расскажет.
Ты хочешь знать на каком самоле-
те я воюю? Пожалуйста. Он на-
зывается ЛИ-2, или „Дуглас".
Это средний бомбардировщик, а так-
же транспортный бомбардировщик.
Берет бомб полторы тысячи килограм.
Высоту набирает в тысячу метров.
Крейсерская скорость у него 260 км.



Может идти на одном моторе.
Может лететь без летчика.
На нем летают: летчик, штурман
радист и стрелок. Очень хорошая
машина. И я уже на ней немало
повоевал.
Ну, все. Будь здоров. Ромочка,
учись еще лучше. А я фрицев
лупить буду еще лучше.
Целую тебя. Эдик.

**Ліст Эдуарда Былінкі пляменніку Рамуальду Чыкалаву. Канец 1942 г. — пачатак 1943 г. Сямейны архіў.**

*"Дорогой Ромочка.*

*Мой тебе боевой привет! И еще, привет бабушке.*

*Рядом сидит твоя мамка, и дядя Василий, и рассказывают о тебе. Они говорят, что ты парень — герой, отличник. Очень образованный, что ты сов. информбюро, и хулиган. Это верно? Только зачем же плакать? Мамка едет ко мне, а ты в слезы. Это тебе не идет. Ты знаешь, я наверно к тебе и к бабушке приеду. Каким образом мамка расскажет.*

*Ты хочешь знать, на каком самолете я воюю? Пожалуйста. Он называется ЛИ-2, или "Дуглас". Это средний бомбардировщик, а также транспортный бомбардировщик. Берет бомб полторы тысячи килограмм. Высоту набирает в тысячу метров. Крейсерская скорость у него 260 км. Может идти на одном моторе. Может лететь без летчика.*

*На нем летает: летчик, штурман, радист и стрелок. Очень хорошая машина. И я на ней уже немало повоевал.*

*Ну все. Будь здоров. Ромочка, учись еще лучше. А я фрицев лупить буду еще лучше.*

*Целую тебя. Эдик".*

Пасля заканчэння Сталінградскай бітвы ў лютым 1943 г., якая завяршылася капітуляцыяй акружанай германскай групоўкі, Эдуард камандаваннем дывізіі быў прадстаўлены да ўрадавай узнагароды — ордэна Чырвонай Зоркі. У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі захоўваецца ўзнагародная справа Эдуарда Былінкі, у якой названыя даты дзяйснення подзвігу: 01.08.1942 г. — 27.01.1943 г. У афіцыйным прадстаўленні да ўзнагароды, падпісаным камандзірам 7-га авіяпалка далёкай авіяцыі падпалкоўнікам В.А.Шчэлкіным, адзначалася: "*За период в действующей армии с августа месяца 1942 года совершил 25 боевых вылетов на разгром германских войск на подступах к гор. Сталинграду. Летая на боевые задания в качестве стрелка-радиста в ночных условиях в составе командира экипажа ст. лейтенанта Болдырева, награжденного орденом "Отечественной Войны I ст." и штурмана Щур, награжденного орденом "Отечественной Войны I ст.". За время выполнения боевых заданий, не имел ни одного случая потери связи самолета с землей, а также с ведущим самолетом. Материальную часть знает хорошо, грамотно ее эксплуатирует, в хорошем состоянии содержит и бережно к ней относится, летает на боевые задания с большим желанием. В боях против немецких фашистов за честь, свободу своей родины, показал себя преданным делу партии Ленина-Сталина, смелым бойцом Красной Армии. Достоин правительственной награды — ордена "Красной Звезды"*[9].

У загадзе 53-й авіяцыйнай дывізіі адзначалася: "*За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым доблесць, мужнасць і адвагу, загадам 53-й авіяцыйнай дывізіі далёкага дзеяння ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР*" (16 лютага 1943 г.)[10]. Неўзабаве Былінка быў узнагароджаны медалём "За абарону Сталінграда".

Эдуард Былінка працягваў вылятаць на баявыя заданні. У ліпені 1943 г. пачалася Арлоўская наступальная аперацыя. З паветра бомбавымі ўдарамі па скопішчах германскай жывой сілы і тэхнікі яе забяспечвала 54-я авіядывізія далёкага дзеяння, у якую 1 чэрвеня быў перададзены яго 7-ы гвардзейскі бамбардзіровачны Гатчынскі Чырванасцяжны авіяполк. Пры падтрымцы авіяцыі ў першыя два дні наступлення сумеснымі дзеяннямі войскаў Заходняга, Бранскага і Цэнтральнага франтоў была прарваная тактычная зона абароны праціўніка на Арлоўска-Курскай дузе. Да 18 жніўня савецкія войскі завяршылі разгром Арлоўскай групоўкі ворага і падышлі да абарончай мяжы праціўніка "Хаген" на ўсход ад Бранска.

Бліжэйшыя задачы авіяцыі далёкага дзеяння вызначыла дынамічнае наземнае становішча на працягу



**Алоўкавы партрэт аднапалчаніна Аляксандра Цімафеевіча Лупіка, зроблены Эдуардам Былінкам. Загінуў у сакавіку 1944 г.**

дня 19 жніўня. Ваенная выведка ў раёне Ахтыркі выявіла рэзерв праціўніка. У групоўцы праціўніка налічвалася 400 танкаў, ім жа супрацьстаяла толькі 30 савецкіх. Таму галоўным аб'ектам для бамбавання ў ноч на 20 жніўня сталі войскі і тэхніка праціўніка ў раёне Ахтыркі. Сюды былі скіраваныя намаганні трох авіякарпусаў. Час удару быў прызначаны на прамежак 22.30—03.00[11]. Позна ўвечары 19 жніўня 1943 г. самалёт ЛІ-2, у складзе экіпажа якога знаходзіўся Эдуард Былінка, адправіўся на сваё апошняе баявое заданне, з якога ён ужо не вярнуўся.

У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі захоўваецца "*Імянны спіс незваротных страт асабістага складу авіяцыйнай дывізіі далёкага дзеяння за перыяд з 10 па 20 жніўня 1943 г.*". У ім пазначана імя Эдуарда Станіслававіча Былінкі[12].

Што ж адбылося з яго самалётам? Карціна здарэння стала вядомая дзякуючы расказам экіпажаў, якія вярнуліся пад раніцу 20 жніўня 1943 г. на аэрадром пасля выканання баявога задання. Яны дакладвалі, што назіралі ў раёне Хляўнога сутыкненне двух самалётаў на вышыні сямісот метраў, водбліск пажараў, іх падзенне і працяг пажараў на зямлі. Як высветлілася, сутыкнуліся два савецкія бамбардзіроўшчыкі — ЛІ-2, які ішоў на заданне, і ІЛ-4 (камандзір Д.І.Барашаў) 10-га гвардзейскага авіяпалка, які вяртаўся з яго. У трох кіламетрах на паўднёвы ўсход ад населенага пункта Калодзезь былі знойдзеныя і згарэлыя самалёты. Абодва экіпажы загінулі. Гэтае трагічнае здарэнне ў небе знайшло адлюстраванне на старонках кнігі ваеннага гісторыка А.М.Сергіенкі[13].

Пры катастрофе самалёта ЛІ-2 загінуў камандзір гвардыі маёр Дыямід Якаўлевіч Пятрэнка, штурман гвардыі лейтэнант Максім Максімавіч Дзікі, стралок-радыст гвардыі старшы сяржант Эдуард Станіслававіч Былінка, паветраны стралок гвардыі старшы сяржант Аляксандр Фёдаравіч Набокіх, бортмеханік гвардыі старшына Аляксей Іванавіч Бакулін[14]. Яны пахаваныя на плошчы Герояў у Ліпецку.

Дзякуючы пошукавай працы, якую некалькі гадоў вядзе Ігар Несвятаеў, унук аднаго з аднапалчан Эдуарда — Леаніда Сямёнавіча Рагожына, выяўлены партрэты двух членаў загінулага экіпажа — Д.Я.Пятрэнкі і М.М.Дзікага.

Маці, Мальвіна Казіміраўна, атрымала з Тамбоўскага гарадскога ваеннага камісарыята афіцыйнае паведамленне аб гібелі пры выкананні баявога задання гвардыі старшага сяржанта Былінкі Эдуарда Станіслававіча (праўда, у ім пазначана няправільная дата — 18 жніўня 1943 г.).

Спадзеючыся даведацца пра лёс сына, Мальвіна Казіміраўна напісала ліст у авіячасць. Адказ напісаў камандзір экіпажа, з якім Эдуард некаторы час лётаў на заданні, Аляксандр Пятровіч Сарока: "*Уважаемая гр. Былинко. Сегодня я прочел письмо, адресованное командиру части, в котором Вы спрашиваете о судьбе своего сына. Я как бывший командир экипажа, в котором находился Ваш сын, в экипаже. Мы совершили больше 40 вылетов на разгром врага. Я с глубоким прискорбием извещаю Вас, что Ваш сын погиб при выполнении боевого задания в ночь с 19 на 20 августа 1943 г. Как честный воин он отдал свою молодую жизнь за великое дело, за честь и независимость нашей родины. Похоронен в братской могиле в городе Липецке.*

*Гвардии лейтенант Сорока*

*6 октября 1943 г.*

*Извещение, документы и вещи отосланы вам давно*".

З часці, дзе служыў Эдуард, прыйшла пасылка, у якую баявыя таварышы беражліва ўклалі гвардзейскі



**Ваенна-транспартны самалёт ЛИ-2, створаны на базе амерыканскага самалёта Дуглас DC-3.**

# ДА ДНЯ ЎСЕНАРОДНАЙ ПАМЯЦІ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА — 22 ЧЭРВЕНЯ





**Камандзір ЛІ-2 Д.Я.Пятрэнка. 7-ы ТБАП. Прыкладна 1941 г.**



**Штурман ЛІ-2 М.М.Дзікі. 7-ы ТБАП. Прыкладна 1941 г.**



**Гвардыі лейтэнант А.П.Сарока. 7-ы ТБАП. 1945 г.**

значок, медаль "За абарону Сталінграда", франтавыя малюнкі Эдуарда і зроблены яго рукамі альбом з сямейнымі расіцкімі фотаздымкамі. Маці перажыла сына ўсяго на адзін год: яна трагічна загінула ў вызваленым Смаленску восенню 1944 г.

Даваенныя сямейныя фатаграфіі Эдуарда і яго родных захаваліся шчаслівым чынам. Яны засталіся ў кватэры ў Оршы, якую яго сястра, мама і пляменнік пакінулі з пачаткам вайны, думаючы хутка туды вярнуцца, — ніхто не мог здагадвацца, што вайна будзе доўгай. Пасля вяртання ў вызваленую Оршу ў кватэры іх сустрэлі новыя жыхары, рэчы зніклі. Сышлі ў топку і кнігі, якія на сваю невялікую зарплату збірала сястра Эдуарда Канстанцыя — аб іх страце яна потым з горыччу ўспамінала. А вось фатаграфіі — бо памяць і ёсць самае каштоўнае — суседзі беражліва захавалі.

З 1965 г. месцам пахавання Эдуарда Станіслававіча Былінкі і яго экіпажа з'яўляецца брацкая магіла на плошчы Герояў г. Ліпецк. У 1965 г., да 20-годдзя Перамогі, было праведзена перапахаванне парэшткаў 64 воінаў з Праабражэнскіх могілак Ліпецка, сярод якіх быў прах Эдуарда Былінкі. Магіла з'яўляецца часткай Мемарыяльнага комплексу ў гонар воінаў-герояў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 21 кастрычніка 1967 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяла з Вечным агнём Славы.

Імя героя Вялікай Айчыннай вайны Эдуарда Станіслававіча Былінкі занесена ў кнігі памяці Тамбоўскай і Ліпецкай абласцей[15].

Эдуард Станіслававіч Былінка не паспеў стварыць сям'ю. Самым блізкім для яго чалавекам была сястра Канстанцыя. Яна разам з сынам у 1946 г. пераехала ў Мінск і больш ніколі не вярталася ў Росіцу, якая патроху ажывала. Аднак памяць аб днях маладосці, праведзенай у Росіцы, і аб трагедыі яе жыхароў яна пранесла праз усё жыццё. Сэрца і душа яе так і не супакоіліся. Смяротны удар спасціг яе 18 лютага 1984 г. — роўна ў гэты дзень 41 год таму была знішчана апошняя партыя людзей у Росіцы. Праз некалькі дзён Канстанцыя Станіславаўна ціха сышла з жыцця. Аж да самага канца яна беражліва захоўвала малюсенькія рэчавыя аскепкі памяці аб адзіным і любімым браце: фатаграфіі,



Форма № 4

ТАМБОВСКИЙ ОБ'ЕДИНЕННЫЙ ГОРОДСКОЙ ВОЕННЫЙ КОМИССАРИАТ

Извещение № 2/5.

Ваш сын гв. ст. сержант
(муж, сын, брат, воинское звание)

Былинко Эдуарт Станиславович
(фамилия, имя и отчество)

Уроженец Витебской области, Дубровенского р-на
(область, район, деревня и село)

в бою за Социалистическую Родину, верный воинской присяге, проявив геройство и мужество, погиб при выполнении боевого задания 18 августа 1943 г.
(убит, ранен и умер от ран)

похоронен на кладбище г. Липецка.
(место похорон)

Настоящее извещение является документом для возбуждения ходатайства о пенсии (приказ НКО СССР № ____).

Тамбовский городской военный комиссар

м. п.

начальник 2й части

**Паведамленне № 2/5 Тамбоўскага аб'яднанага гарадскога ваеннага камісарыята. Сямейны архіў.**



Кому Былинко Мальвина Казимировна

ВОЙСКОВАЯ ЧАСТЬ
ПОЛЕВАЯ ПОЧТА
15479
20. 8. 1943 г.
№

СПРАВКА

Настоящем удостоверяю, что Ваш сын гвардии ст. сержант Былинко Эдуард Станиславович

за образцовое выполнение боевых заданий Командования на фронте борьбы с немецкими захватчиками и проявленные при этом доблесть и мужество, награжден ОРДЕНОМ Красной Звезды пр. 53/н от 16.2.43 г.

Справка выдана для представления в местный совет депутатов трудящихся для получения льгот, согласно Общего положения об орденах Союза ССР и указания Президиума Верховного Совета Союза ССР № 576 от 17 Ноября 1942 г.

НАЧАЛЬНИК ШТАБА В/ЧАСТИ 15479
ГВАРДИИ МАЙОР /ГРАЧЕВ/

**Даведка Былінцы Мальвіне Казіміраўне. 20.08.1943 г. Сямейны архіў.**

гвардзейскі значок, медаль "За абарону Сталінграда", паведамленне аб гібелі, лісты з фронту і яго франтавыя малюнкі. Так Эдуард выглядаў на апошнім захаваным фотаздымку.

Намаганнямі Ігара Несвятаева, унука Л.С.Рагожына, які ваяваў у складзе 7-га авіяцыйнага палка, на партале "Перамога 1945" створана старонка , якая змяшчае спіс ветэранаў палка, іх фатаграфіі і персанальныя старонкі[16].

---

[1] Энциклопедический словарь Ф.А.Брокгауза и И.А.Ефрона. СПб.,1899. Т. 27. С. 101.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1403, воп. 1, спр. 174, арк. 25—26; Спр. 342, арк. 36, 48—48 адв.; Ф. 1403, воп. 1, спр. 171, арк. 3; Государственный архив Витебской области. Ф. 3719, воп. 1, спр. 2, арк. 7—8; Памяць: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Верхнядзвінскі раён. Кн. 1. Мінск, 2000. С. 292, 335; "Зимнее волшебство". Нацистская карательная операция в белорусско-латвийском пограничье, февраль — март 1943 г.: документы и материалы. Москва, 2013. С. 410.




**Брацкая магіла на плошчы Герояў г. Ліпецк, у якой пахаваны Э.Былінка.**

[3] Гл.: Росица: Белорусские деревни, сожжённые в годы Великой Отечественной войны. База данных [Электронны рэсурс] // НАРБ. [Рэжым доступу]: http://db.narb.by/search/4002. Дата доступу: 10.05.2022; "Зимнее волшебство". Нацистская карательная операция в белорусско-латвийском пограничье, февраль — март 1943 г. С. 411; Без срока давности: преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны. Беларусь. Витебская область: сб. архивных документов и материалов. Минск, Москва, 2020. С. 425.

[4] Военный трибунал Белорусского военного округа, 15 сентября 1960 г. № 1050. г. Минск. Справка о реабилитации Былинко Станислава Фомича. УКГБ по Витебской обл. Справа 10363-П.

[5] З 26 сакавіка 1943 г. перайменаваны ў 7-ы Гвардзейскі бамбардзіровачны Гатчынскі Чырванасцяжны авіяполк. 1 чэрвеня 1943 г. загадам па Авіяцыі далёкага дзеяння №0056 ён быў уключаны ў 54-ю авіяцыйную дывізію далёкага дзеяння.

[6] Воинская часть: 7 ап дд 53 ад дд. Именной список части // ЦАМО. Ф. 10115, оп. 2, д. 6.

[7] Там жа. Ф. 58, оп. 18001, д. 568.

[8] Раткин В.М. Авиация в Сталинградской битве. Москва, 2013. С. 184.

[9] Наградной лист. Былинко Эдуард Станиславович. 28 января 1943 г. // ЦАМО. Ф. 33, оп. 682526, ед. хр. 69.

[10] Приказ 53 авиационной дивизии дальнего действия № 11ок от 16.02.1943 г. // ЦАМО. Ф. 10, оп. 682526, ед. хр. 69; ЦАМО. Былинко Эдуард Станиславович. Картотека награждений. Шкаф 14. Ящик 23.

[11] Сергиенко А.М. Бомбардировщики Авиации дальнего действия в небе над Курской дугой. Белгород, 2007. С. 485.

[12] Именной список безвозвратных потерь личного состава авиационной дивизии дальнего действия за период с 10 по 20 августа 1943 г. // ЦАМО. Ф.58. Оп. 18001. Д. 568.

[13] Сергиенко А.М. Бомбардировщики авиации дальнего действия в небе над Курской дугой. С. 489—491.

[14] 7-й гвардейский бомбардировочный Гатчинский Краснознаменный авиационный полк // Авиаторы Второй мировой [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://allaces.ru/p/ls.php?div=bap007007. Дата доступу: 10.05.2022; 7-й ТБАП (тяжелобомбардировочный авиационный полк), впоследствии 7-й Гвардейский бомбардировочный Гатчинский Краснознаменный авиационный полк // Победа. 1945 [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://www.pobeda1945.su/division/10293. Дата доступу: 10.05.2022.

[15] Книга памяти. Тамбовская область. В 10 т. Т. 1. Тамбов, 1994. С. 59; Липецкая областная книга памяти.Т. 1. Липецк, 1995. С. 24.

[16] 7-й ТБАП (тяжелобомбардировочный авиационный полк), впоследствии 7-й Гвардейский бомбардировочный Гатчинский Краснознаменный авиационный полк // Победа 1945. Никто не забыт. Ничто не забыто! Первая социальная сеть о Второй мировой войне [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.pobeda1945.su/division/10293. Дата доступу: 10.05.2022.

# ДА ДНЯ ЎСЕНАРОДНАЙ ПАМЯЦІ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА — 22 ЧЭРВЕНЯ





**Росіцкі Свята-Траецкі касцёл.**




**Мемарыяльны знак у памяць аб ахвярах мірнага насельніцтва ў вёсцы Росіца.**

**Росіца** — адно з ранніх паселішчаў Паўночна-Заходняга Падзвіння. Першыя пісьмовыя згадкі пра яго датуюцца 1599 г., калі паселішча было выкуплена Львом Сапегам у Давыда Росіцкага. У 1772 г. Росіца ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі і знаходзілася ў Дрысенскім павеце Віцебскай губерні. Тут былі царква, касцёл, сінагога, а росіцкія кірмашы збіралі шмат навакольнага насельніцтва. Згадвае Росіцу і Энцыклапедычны слоўнік Бракгаўза і Ефрона: "*мястэчка Віцебскай губерні, Дрысенскага павета, пры рацэ і возеры той жа назвы, у 19 вёрстах ад павятовага горада. Жыхароў 300*"[1].

Росіца, размешчаная на самай мяжы з Латвіяй, была шматнацыянальнай і поліканфесійнай з перавагай каталікоў. Адсюль імёны жыхароў — Казімір, Станіслаў, Мальвіна, Канстанцыя, Эдуард, Рамуальд. У 1911 г. у Росіцы было завершана будаўніцтва касцёла Святой Тройцы — гарманічнай неараманскай мураванай базілікі яе вежы былі увянчаныя высокімі спічанамі.

У канцы 1930-х гг. у Росіцы быў 231 сялянскі двор з 940 жыхароў[2]. Вёска была моцнай, з заможнымі гаспадаркамі. Праўда, касцёл да гэтага часу быў ператвораны ў клуб, у 1934 г. з яго знялі вежы, якія рабілі яго самым высокім збудаваннем у наваколлі, але нават у такім усечаным выглядзе ён быў выдатны ў сваёй строгай і трагічнай веліччы. Вёска стаяла на беразе найпрыгажэйшага возера з той жа назвай. Паблізу знаходзілася невялікае возера Бутрамеева, ланцуг азёр замыкалі Белае і Чорнае.

16 лютага 1943 г. пачалася карная аперацыя "Зімовае чарадзейства", мэтай якой было стварэнне ўздоўж латвійскай мяжы шматкіламетровай паласы "мёртвай зямлі". Росіца стала першай вёскай на шляху карнікаў. Моладзь адпраўлялася ў лагер смерці Саласпілс і остарбайтарамі ў Германію. Астатнія жыхары былі спаленыя ў дамах, а на трэці дзень аперацыі вялікая група людзей, у тым ліку сагнаных з іншых вёсак, якая чакала сваёй долі ўнутры Свята-Траецкага касцёла, была загнаная ў хлеў, які затым падпалілі. Добраахвотна іх лёс падзялілі ксяндзы Антоні Ляшчэвіч і Юры Кашыра. За тры дні, з 16 па 18 лютага 1943 г., карнікамі 279-га Айзпуцкага латышскага паліцэйскага батальёна ў Росіцы было забіта, па розных дадзеных ад 1258 (звесткі НАРБ) да 1528 (такая лічба пазначаная ў самой Росіцы на памятнай дошцы) чалавек[3], знішчаныя ўсе дамы. Толькі пасля заканчэння вайны нешматлікія ацалелыя сведкі распавялі аб трагедыі, якая здарылася ў Росіцы. І яшчэ шмат гадоў пасля ў 2013 г. выйдзе зборнік дакументаў "*Зімовае чарадзейства. Нацысцкая карная аперацыя ў беларуска-латвійскім памежжы*". Трагічным быў і лёс яўрэйскага насельніцтва Росіцы. З пачаткам акупацыі нацысты ўсіх яўрэяў у мястэчку, якія засталіся, сабралі і вывезлі з вёскі нібыта ў Верхнядзвінск. Ніхто з іх назад не вярнуўся.

У 1999 г. ксяндзы Свята-Траецкага касцёла Антоні Ляшчэвіч і Юры Кашыра былі беатыфікаваныя Папам Рымскім Янам Паўлам II. Двойчы ў год — у лютым і жніўні — Росіца збірае пілігрымаў з розных краін, якія са свечкамі ў руках ідуць апошняй дарогай росіцкіх пакутнікаў — да іх брацкай магілы.

**Электронны банк дакументаў "Подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг."**

**Партал "Памяць народа".**